Весткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

Viestki j Paviedamlenni

Сусьветнае сеціва: *e-krama.com, www.baza-belarus.org*
Электронны адрас: *viestki@mail.com*
✉ *VIESTKI, P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735*

№ 11 (561)
Лістапад 2012 г.

Кастрычніцкі сход Згуртаваньня "Пагоня" і прэзэнтацыя альманаха "Беларус" за 2012 год

У суботу 20 кастрычніка адбыўся чарговы сход Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "Пагоня". Напачатку сходу старшыня арганізацыі сп. Віталь Зайка прадставіў прысутным госьця "Пагоні" – літаратуразнаўцу, выдаўца і грамадзкага дзеяча беларусаў у Польшчы (Познань) сп. Віталя Воранава.

Госьць распавёў крыху пра сябе і пра беларускую грамаду ў Познані. Сам ён у Польшчы з 1996 году, скончыў унівэрсытэт, займаецца перакладамі, піша прозу і п'есы. Сп. Воранаў коратка спыніўся на беларускім жыцьці ў Познані, на дзейнасьці Беларускага Культурна-Асьветніцкага Цэнтру ў гэтым горадзе, якому ў лістападзе спаўняецца 10 год. Ён закрануў адрозьненьні, што, на ягоную думку, існуюць паміж беларускай грамадой у Амэрыцы і адносна нядаўна паўстаўшымі асяродкамі беларусаў у Польшчы, пра крыху іншыя абставіны і ўяўленьні. Прамоўца адзначыў, што адною з важных мэтаў дзейнасьці Цэнтру ёсьць наблізіць Беларусь для палякаў і адукоўваць іх, даваць аб'ектыўную інфармацыю пра беларускае грамадзтва, беларускую культуру. "І праз гэта ёсьць мажлівасьць уплываць на польскую грамадзкую думку, на палітыкаў – бо Польшча, як бы хто да яе ня ставіўся, ёсьць рэальным гульцом на беларускім палітычным полі". Гаворачы пра культурніцкую дзейнасьць на беларускай ніве, сп. Воранаў падкрэсьліў неабходнасьць стварэньня культурнага прадукту, хай гэта будзе кніга, музычны альбом, фотаальбом, імпрэза – усё гэта



Віталь Воранаў

Працяг на бачыне 2

Кастрычніцкі сход і прэзэнтацыя альманаха

Працяг зь 1-й бачыны

ёсьць праца на карысьць Беларусі, гэта ёсьць рэальны прадукт.

Сп. Воранаў коратка спыніўся на сёлетнім фэстывалі беларускай незалежнай культуры ў Познані і на тым, што пасьля ягоных захадаў кіраўнік Вялікапольскага ваяводзтва заявіў, што калі на фэстывалі будзе папсовы гурт "Рокер-Джокер", што меўся прыехаць зь Беларусіі, і што ў свой час адзначыў сябе песьняй у падтрымку Лукашэнкі "Саня астанецца с намі", дык фэстываль не атрымае абяцанага раней дзяржаўнага фінансаваньня. Сп. Воранаў дадаў, што цяпер сярод познаньскіх беларусаў – шмат творчых асобаў, мастакоў, літаратараў, і гэта ствараe асаблівыя ўмовы для разьвіцьця беларускай прысутнасьці ў гэтай частцы Польшчы...

Прамоўца таксама распавёў пра сваю праграму стажыроўкі й выкладаньня ў Амэрыцы ў Цэнтры Беларускіх Дасьледваньняў пры Паўднёва-Заходнім Унівэрсытэце ў штаце Кэнзас, пра сваю асноўную дасьледчую і перакладчыцкую дзялянку – ірляндскую літаратуру і творчасьць Сэм'юэла Бэкета. Сп. Воранаў адзначыў, што ў Кэнзасе студэнты-амэрыканцы ахвотна бяруць курсы па беларусай мове й культуры, і навучаньне пастаўленае на досыць высокім прафэсійным узроўні.

ПРЭЗЭНТАЦЫЯ

Падчас сходу адбылася прэзэнтацыя альманаху "Беларус" за 2012 год, якую вёў рэдактар штогадовіка Марат Клакоцкі. Напачатку ён спыніўся на гісторыі стварэньня гэтага выданьня. Галоўнай ідэяй было даць пляцоўку для творчай актыўнасьці людзей, што зацікаўленыя ў стварэньні мастацкіх твораў на беларускай мове й жывуць па-за межамі Беларусі. Пры ўсіх цяжкасьцях і заганах выдавецкай справы па-беларуску на Бацькаўшчыне, аўтары там усё ж маюць шляхі для выданьня сваіх твораў, ёсьць выдавецтвы, выходзяць кнігі. Для аўтараў у замежжы такія магчымасьці да нядаўняга часу былі цалкам адсутныя. Менавіта для такіх аўтараў у замежжы альманах "Беларус" стаў пляцоўкай для спробы й выпрабаваньня творчых сілаў, для працягу й разьвіцьця традыцыяў, што былі закладзеныя нашымі папярэднікамі праз альманахі "Ля чужых берагоў" і "Конадні".

Пачыналася выданьне альманаху пры газэце "Беларус", і тады ён (да 2010 году) выходзіў за сродкі рэдакцыі газэты. Цяпер альманах выдаецца выключна на ахвяраваньні дабрадзеяў. Друк такога кшталту выданьня досыць дарагі, а продаж не пакрывае ўсіх выдаткаў. Таму на першай старонцы альманаху пералічаныя ўсе дабрадзеі, што ахвяравалі грошы на гэты нумар. Сёлета альманах выйшаў большым памерам, чым папярэднія выпускі, і зьмяшчае творы 24 аўтараў з 10 краінаў сьвету.

Сярод цяжкасьцяў, зьвязаных з выданьнем, рэдактар назваў праблемы з распаўсюдам, бо альманах мог бы разыходзіцца значна шырэй. Цяпер выданьне трапляе таксама ў Беларусь. Каля 50 асобнікаў дасылаюцца ў бібліятэкі, навучальныя ўстановы, грамадзкія арганізацыі і прыватным асобам, зьвязаным зь літаратурай, літаратурнай крытыкай і кнігавыданьнем. Нажаль, розгалас пра выданьне ў Беларусі пакуль мала заўважны. Альманах таксама дасылаецца ў 7-8 вядучых унівэрсітэтаў ЗША, па некалькі асобнікаў ідуць ва ўнівэрсітэты й дасьледныя цэнтры ў Англіі, Францыі, Канадзе, Польшчы, Швэцыі.

Сп. Віталь Воранаў, як адзін з аўтараў і распаўсюднікаў альманаху, дадаў, што хіба самая вялікая складанасьць – гэта, часам, адсутнасьць разуменьня. Людзі не здаюць сабе справы, наколькі важным ёсьць такое выданьне. Гэта, у пэўным сэньсе, адраджэньне такой справы, як выданьне альманахаў "Конадні", "Ля чужых берагоў" – адраджэньне пэўнай ідэі, сьведчаньне прысутнасьці беларускага слова ў сьвеце. Сп. Воранаў сказаў: "Справа такога выданьня – наагул фэнамэнальная. Я ня ведаю пра адпаведнік гэтаму беларускаму альманаху ў польскай, украінскай ці чэскай грамадзе". Ён таксама адзначыў, што пісаў у газэце "Новы Час" пра тое, што беларускія праекты будуць пасьпяховымі толькі тады, калі будуць фінансаваныя беларусамі – і вось тут у нас акурат беларускі прадукт, што выйшаў за беларускія грошы, і ніхто іншы ня можа накінуць свае ўмовы й свае прыхамаці.

Сярод пытаньняў, якія штораз узьнікаюць пры выхадзе новага выпуску "Беларуса" сп. Клакоцкі адзначыў дызайн вокладкі, і што добра было б, каб знайшліся сярод нашых людзей мастакі, якія



маглі-б супрацоўнічаць з альманахам і дапамагаць у ягоным мастацкім аздабленьні.

Затым перад прысутнымі выступіў старшыня Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва (БІНіМ) сп. Вітаўт



Вітаўт Кіпель

Кіпель. Ён адзначыў важнасьць выхаду яшчэ аднаго нумару “Беларуса”, як працягу традыцыі, закладзенай прадстаўнікамі паваеннай эміграцыі, якія таксама стварылі ў 1951 г. Беларусі Інстыту Навукі й Мастацтва ў Нью-Ёрку. Сп. Кіпель спыніўся на гісторыі Інстытуту і даў кароткі агляд гісторыі беларускай грамады ў ЗША, яе культурніцкай і асьветнай дзейнасьці. Прамоўца адзначыў, што калі першая хваля эміграцыі, дарэвалюцыйная, няўсьведамленая, “безназоўная” – пакінула толькі этнаграфічныя адзнакі сваёй прысутнасьць, дык паваенная хваля, як найбольш арганізаваная, заклала падваліны сур’ёзнага культурніцкага кшталту, на якіх шэраг дзесяцігодзьдзяў грунтавалася беларускае грамадзкае жыцьцё ў Амэрыцы. Цяперашняя хваля беларускай эміграцыі, як бачым, далучаецца да ўсталяванай традыцыі, імкнецца адзначыць свой досьвед, высунула шэраг аўтараў і мае сваіх выдаўцоў. Сп. Кіпель, у прыватнасьці, адзначыў, што беларусы любяць пісаць, любяць сьпяваць, і як жа добра, што напісанае ёсьць каму выдаць, данесьці да чытача. Такія выданьні, як альманах “Беларус”, робяць вельмі патрэбную справу – злучаюць беларусаў сьвету. Сп. Кіпель выказаў вялікую падзяку сп. Марату Клакоцкаму за плённую нялёгкую працу па выданьні альманаха.

Наступнымі выступілі прысутныя на прэзэнтацыі аўтары выданьня. Першым быў сп. Віталь Воранаў з Познані, зь якім прысутныя ўжо пасьпелі пазнаёміцца па ягоных папярэдніх выступах. Ён сказаў, што ня дужа любіць распавядаць пра сваю творчасьць, бо калі трэба нешта тлумачыць пра свой тэкст – значыць, тэкст не гаворыць сам за сябе, то бок не адпавядае мэце, зь якой быў створаны. Але наўзамен прамоўца прапанаваў прачытаць тры свае невялікія творы, “ два вясёлыя і адзін змрочны... а можа й ня змрочны”. Сярод прачытаных мініаповядаў былі “Сон”, “Мухі ў галаве” і “Чаго бракуе Беларусі”. Сп. Воранаў адказаў на пытаньні прысутных і, у прыватнасьці, сказаў, што лічыць сябе хутчэй не пісьменьнікам, а літаратарам, і што пісаць цяпер на беларускай мове – гэта ў пэўным сэнсе ахвяра, але таксама і выхад на нейкія новыя вымярэньні творчасьці. Прамоўца згадаў пра свае перакладчыцкія праекты, мастацкі супольны праект Belarus Inside Out, пра свой блёг на польскай мове, пра пісаньне па-ангельску і пра пераклады сваіх твораў па-польску, якія робіць знаёмая калега-полька.

Затым наступны сп. Віталь Зайка, коратка распавёўшы пра матывы напісаньня свайго аповяду, і адзначыўшы, што



Віталь Зайка

зацікавіўся Нью-Ёркам 1940-50-х і паспрабаваў уявіць ды пераасэнсаваць пачуцьці й уражаньні беларусаў з паваеннай іміграцыі, што прайшлі праз цяжкія выпрабаваньні вайны й выгнаньня і, нарэшце, апынуліся на берагох “зямлі свабоды”. Затым сп. Зайка спыніўся на патрэбе культываваньня беларускамоўнага чытача, бо калі ёсьць беларускамоўныя аўтары, і выходзяць беларускія выданьні – дык неабходна таксама, каб гэтыя выданьні трапілі ў рукі чытача. Тут можна было-б скарыстаць мэтады прыахвоціць да чытаньня, “завабіць” чытача, якія даўно ўжо адпрацаваныя ў Амэрыцы – чытацкія дыскусійныя групы, клюб “Кніга месяца”, Кніжны клюб, тэлепраграма Опры Ўынфры і г. д. Беларускае чытаньне можа быць патрыятычным учынкам, у тым ліку тады, калі кожныя іншыя дзеяньні па замаганьні за беларускасьць па розных прычынах немажлівыя. І што чытаць беларусу тут, у Амэрыцы, па-беларуску, як не альманах, напісаны й выдадзены ягонымі землякамі, якіх напаткаў падобны лёс, якія маюць падобныя турботы, клопаты й радасьці.

Уладыка Юры (Эмігідыюш Рыжы), які стаў сталым аўтарам альманаху, адзначыў важнасьць беларускага слова й вы-



Уладыка Юры

даўніцтва тут, далёка ад Бацькаўшчыны, для беларускай грамады ў справе захаваньня духовасьці й сардэчнай сувязі са сваім родным краем. Ён падзякаваў рэдактару альманаху за ахвярную працу і заклікаў усіх падтрымліваць ініцыятыву сп. Клакоцкага й ягоную працу, каб такая карысная й неабходная дзейнасьць не заняпала, а працягвала радаваць і натхняць новыя шэрагі беларусаў.

Наступнай выступіла сп-ня Валянціна Якімовіч, якая распавяла перадгісто-

Заканчэньне на 4-й бачыне




Валянціна Якімовіч

Заканчэньне з 3-й бачыны

рыю падзеяў, што апісаныя ў яе тэкстах, менавіта пра сустрэчы са славутым беларускім паэтам Анатолем Сысом. “Наколькі глыбокімі былі мае пачуцьці да яго – я зразумела ўжо пазьней тут, у Амэрыцы”. Сп-ня Якімовіч таксама коратка распавяла пра беларускі маладзёвы рух у 1980-я гады, пра “нефармальную” суполку “Талака”. Затым яна прачытала ўрывак са свайго апавяданьня, поўны інтымнага лірызму і паэтычнасьці. Уканцы свайго выступу яна прачытала верш Анатоля Сыса “Маналёг Каруся Каганца”.

Апошнім з выступіўшых аўтараў быў сп. Сяржук Сокалаў-Воюш, славуты паэт, стваральнік і выканаўца песень, а таксама празаік і драматург. Ён коратка распавёў пра свой тэкст у гэтым нумары альманаха і пра працяг сваёй кнігі “Крывавы памол”. З уражаньнямі ад тэксту сп. Сокалава-Воюша выступіла прысутная карэктарка альманаху Алена Высоцкая, якая пашкадавала, што надрукаваны быў толькі ўрывак з рамана, настолькі ён быў цікавым і інтрыгуючым. Аўтар запэўніў, што на гэтым ён не спыніўся, і працяг абавязкова будзе.



Сяржук Сокалаў-Воюш

Яшчэ адная з прысутных на прэзэнтацыі аўтарак альманаху маладая паэтка спч-ня Таццяна Саланко не змагла выступіць з-за хваробы і прастуджанага горла, але падзякавала рэдактару за выданьне.

Прысутныя мелі нагоду набыць, па зьніжанаму толькі на дзень прэзэнтацыі кошту, прэзэнтаваны выпуск альманаху.

У самым канцы імпрэзы ўдзельнікі сходу і прэзэнтацыі маглі паддзяліцца ўражаньнямі, а таксама абмеркаваць розныя іншыя пытаньні пры кілішку віна ды пачастунках.

Віталь ЗАЙКА

Наведаўшы ў інтэрнэце старонку **e-krama.com**, жадаючыя могуць набыць усе папярэднія нумары літаратурнага альманаху “Беларус” за 2007-2011 гады.

Кошты для жыхароў ЗША, у залежнасьці ад гадоў выданьня, наступныя:
“Беларус”2007 - **$16**, *”Беларус”2008* - **$16**, *“Беларус”2009* - **$17**, *“Беларус”2010* - **$17**, *“Беларус”2011* - **$12.**



Замовы і аплату можна таксама дасылаць поштаю на адрас рэдакцыі:

BIELARUS
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

Чэкі выпісвайце на імя выдаўца **Marat Klakotski**.

З пытаньнямі зьвяртайцеся на электронны адрас: ***zamova@e-krama.com***

Уплаты ў Згуртаваньне
Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàíüí³:

А. Ахмяненка ....**.50**
Н. Бруй ....**.50**
К. Бусько ....**.50**
С. Волкаў ....**.50**
А. Галюкевіч ....**.50**
д. Ляшчонак ....**.50**
А. Петрукевіч ....**.50**
А. Шадрына ....**.50**

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:
P. O. Box 572
New York, NY 10113
Чэкі выпісвайце на імя
Valentina Balashchenko.

Паважаныя ***Анастасія Жаркова, Іна Міуская, Юлія Самусева, Аляксандра Супрун,*** *калі ласка, паведаміце рэдакцыі вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “ПАГОНЯ” адбудзецца **ў суботу 10-га лістапада 2012 году.**

Месца правядзеньня сходу:

Seafarers and International House
123 East 15th Street
New York, NY 10003.

Даезд цягнікамі падземкі ***L, N, Q, R, W, 4, 5, 6*** *да станцыі падземкі* ***Union Square****.*

Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Union Square па 15-й вуліцы на скрыжаваньні з Irving Place.

Заля на другім паверсе.

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

Аб месцы і часе правядзеньня сходаў ды іншых імпрэзаў, ладжаных арганізацыямі, можна даведацца, наведаўшы ў інтэрнэце ўэбстаронку ***www.baza-belarus.org***

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні* :

Я. Барысевіч ....**.30**
К. Бусько ....**.30**
А. Галюкевіч ....**.30**
В. Кіпель ....**.30**
Д. Ляшчонак ....**.30**
А. Петрукевіч ....**.30**
Т. Саланко ....**.30**
А. Шадрына ....**.30**

Шчыры дзякуй!

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*
VIESTKI
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735
Чэкі з адзнакаю ***“Весткі”*** *выпісвайце на імя*
Valentina Balashchenko*.*
Падпіску таксама можна аформіць, наведаўшы сайт ***www.e-krama.com***